УДК 94“1630/1640”(4)

# Палітыка дзяржавы ў адносінах каралеўскіх эканомій на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў 1630–1640-я гады

**Галубовіч В.У.**
*Установа адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”, Гродна*

*Даследаванне дзяржаўнага сектара гаспадаркі з’яўляецца важным напрамкам вывучэння эканамічнай гісторыі Беларусі і гісторыі айчыннай дзяржаўнасці. Да ліку асобнай разнавіднасці дзяржаўнай зямельнай уласнасці на беларускіх землях у эпоху існавання Рэчы Паспалітай адносіліся каралеўскія эканоміі – уладанні, падаткі з якіх прызначаліся на ўтрыманне манарха. На практыцы за кошт эканомій утрымлівалася ўся дзяржаўная сістэма Рэчы Паспалітай. Маловядомай старонкай гісторыі застаецца спроба ўдасканалення практыкі кіравання каралеўскіх эканомій, прадпрынятая ў час праўлення Уладзіслава Вазы (1633–1648 гг.).*

*Мэта публікацыі – аналіз змен палітыкі дзяржавы ў адносінах каралеўскіх эканомій на тэрыторыі ВКЛ у другой палове 1630–1640-х гадах.*

***Матэрыял і метады.** Даследаванне было праведзена на аснове заканадаўства Рэчы Паспалітай і актавых матэрыялаў з дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага – Метрыкі. Дадзеная навуковая праца з’яўляецца працягам вывучэння аўтарам дзяржаўнай палітыкі на беларускіх землях ВКЛ у час праўлення Уладзіслава Вазы. Артыкул падрыхтаваны з улікам гістарыяграфіі па вышэйназванай праблеме. Выкарыстаны агульнагістарычныя і спецыяльныя метады, сярод якіх гістарычна-апісальны, параўнальна-гістарычны, гістарычна-сістэмны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** У артыкуле прааналізаваны пастановы сеймаў Рэчы Паспалітай і кантрактныя абавязацельствы адміністратараў каралеўскіх эканомій часоў праўлення Уладзіслава Вазы. Актыўнае сеймавае заканадаўства 1633–1647 гг. адносна эканомій было вынікам нездавальняючага становішча каралеўскага скарбу і нежадання шляхты кампенсаваць дэфіцыт выдаткаў праз увядзенне новых падаткаў. Змены дзяржаўнай палітыкі ў адносінах эканомій у другой палове праўлення Уладзіслава Вазы адбываліся на аснове сеймавага заканадаўства, а выразнай вяхой стала сеймавая пастанова, прынятая ў 1641 г. Адной з уведзеных мер было абмежаванне тэрмінаў дзеяння кантрактаў на арэнду эканомій. Адбылася ратацыя адміністратараў шэрагу эканомій. Паўнавартасная рэалізацыя сеймавых пастаноў у адносінах эканомій была немагчымай па прычыне сацыяльнай палітыкі дзяржавы, якая абапіралася на арыстакратыю, служылаю шляхце, але не магла ігнараваць інтарэсы насельніцтва эканомій.*

***Заключэнне.** Рост колькасці сеймавых пастаноў адносна каралеўскіх эканомій у першыя гады праўлення Уладзіслава Вазы сведчыў пра неабходнасць змены палітыкі ў адносінах дзяржаўных уладанняў. Аўтар прыходзіць да высновы, што рэалізацыя сеймавых пастаноў набыла форму больш жорсткага персанальнага кантролю за асобамі, якія атрымлівалі арэндныя і адміністрацыйныя кантракты. Адміністраванне эканоміямі стала канцэнтравацца ў руках земскага падскарбія ВКЛ.*

***Ключавыя словы:** дзяржава, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, сейм, манарх, шляхта, эканомія, сеймавая пастанова, кіраванне.*

*(Ученые записки. – 2025. – Том 41. – С. 18–23)*

# State Policy towards Royal Estates in the Territory of the Grand Duchy of Lithuania in the 1630s–1640s

**Halubovich V.U.**
*Education Establishment “Hrodna State Agrarian University”, Hrodna*

*The study of the state sector of the economy is an important direction in the study of the economic history of Belarus and the history of national statehood. A separate type of state land ownership in the Belarusian lands during the era of the Polish-Lithuanian Commonwealth were royal estates – estates from which taxes for the maintenance of the monarch were deducted. In fact, the entire state system of the Polish-Lithuanian Commonwealth was supported by savings. The attempt to improve the management practices of royal finances, undertaken during the reign of Ladislas Vasa (1633-1648) still remain an unknown aspect of history.*

*The purpose of this article is to analyze the changes in state policy regarding royal estates in the territory of the Grand Duchy of Lithuania in the second half of the 1630s and 1640s.*

Адрас для карэспандэнцыі: ***e-mail: e-mail: logos@ggau.by*** – В.У. Галубовіч

***Material and methods.*** *The research was conducted on the basis of the legislation of the Polish-Lithuanian Commonwealth and the official materials of the state archive of the Grand Duchy of Lithuania – Metrica. The article is a continuation of the author's research on state policy in the Belarusian lands of the Grand Duchy of Lithuania during the reign of Ladislas Vasa. The article was prepared taking into account the historiography on the issue. General historical and special methods were applied: historical-descriptive, comparative and systemic ones.*

***Findings and their discussion.*** *The article analyzes the resolutions of the Seym of the Polish-Lithuanian Commonwealth and the contractual obligations of the managers of the royal finances during the reign of Ladislas Vasa. The active parliamentary legislation of 1633–1647 regarding savings was the result of the unsatisfactory state of the royal treasury and the unwillingness of the nobility to compensate for the deficit in spending by introducing new taxes. Changes in state policy regarding savings in the second half of the reign of Ladislas Vasa took place on the basis of parliamentary legislation, and a bright milestone was the parliamentary resolution adopted in 1641. One of the adopted measures was the limitation of the lease agreements terms of the estates. There was a rotation of several royal estates administrators. Full implementation of the Seym resolutions in the field of economy was impossible due to the social policy of the state, which relied on the aristocracy and served the nobility, but could not ignore the interests of the population living in the royal estates.*

***Conclusion.*** *The increase in the number of Diet decrees regarding royal savings in the first years of Ladislas Vasa's reign indicated the need for a change in policy regarding state possessions. The author comes to the conclusion that the implementation of the resolutions of the Diet took the form of tightening control over persons receiving lease and administrative contracts. Management of savings became concentrated in the hands of the Minister of Finance of the Grand Duchy of Lithuania.*

***Key words:*** *state, Grand Duchy of Lithuania, Polish-Lithuanian Commonwealth, Seym, monarch, nobility, economy, Diet decree, governance.*

*(Scientific notes. – 2025. – Vol. 41. – P. 18–23)*

Гісторыя дзяржаўных зямельных уладанняў у Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) не раз прыцягвала ўвагу замежных і айчынных даследчыкаў, вынікам чаго стала грунтоўнае вывучэнне становішча каралеўскіх эканомій у другой палове XVII – XVIII стст. [1–3]. Аднак пра каралеўскія сталовыя ўладанні ў першыя дзесяцігоддзі іх існавання (канец XVI ст. – першая палова XVII ст.) гістарыяграфія абмяжоўваецца звесткамі аб прыбытках ад эканомій за пэўныя гады альбо прэзентацыяй становішча асобных эканомій [4, s. 364–368, 388–389; 5; 6]. Важнай старонкай гісторыі дзяржаўнай гаспадаркі на тэрыторыі ВКЛ былі мерапрыемствы, накіраваныя на павелічэнне прыбытковасці эканомій. Да найменш вядомых у гістарыяграфіі спроб дзяржавы ўдасканаліць сістэму кіравання эканоміямі адносіцца эпоха праўлення ў Рэчы Паспалітай Уладзіслава Вазы (1633–1648).

Мэта артыкула – аналіз змен палітыкі дзяржавы ў адносінах каралеўскіх эканомій на тэрыторыі ВКЛ у другой палове 1630 – 1640-х гадах.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне было праведзена на аснове заканадаўства Рэчы Паспалітай і актавых матэрыялаў з дзяржаўнага архіва ВКЛ – Метрыкі. Артыкул з'яўляецца працягам вывучэння аўтарам дзяржаўнай палітыкі на беларускіх землях ВКЛ у час праўлення Уладзіслава Вазы. Дадзеная публікацыя падрыхтавана з улікам айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Выкарыстаны агульнагістарычныя і спецыяльныя метады, сярод якіх гістарычна-апісальны, параўнальна-гістарычны, гістарычна-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На сейме Рэчы Паспалітай 1589 г. была праведзена рэарганізацыя структуры дзяржаўных уладанняў у ВКЛ. Галоўным эфектам гэтага мерапрыемства стала з'яўленне так званых сталовых эканомій, прыбыткі з якіх збіраліся на ўтрыманне манарха і яго двара. Дзве эканоміі размяшчаліся на тэрыторыі Літвы, чатыры – поўнасцю ці часткова знаходзіліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Да ліку апошніх належалі Гродзенская, Брэсцкая, Магілёўская, Кобрынская эканоміі [7, s. 289]. Яны давалі асноўную частку грошай на ўтрыманне не толькі манарха, але і функцыянаванне дзяржаўнай улады на тэрыторыі ўсяго ВКЛ. Толькі ў 1642 г. тры беларускія эканоміі (Гродзенская, Брэсцкая і Магілёўская) далі ў скарб без малога 265 000 злотых [8, s. 14–17]. Фактычна, манархаў і дзяржаву "народа ВКЛ" кармілі пераважна беларускія сяляне.

Кіраванне эканоміямі на тэрыторыі ВКЛ ажыццяўляла адміністрацыя, якую прызначаў манарх. У выпадку здачы эканоміі ў арэнду ўсімі справамі кіраваў арандатар. Кантроль за дзейнасцю адміністрацыі і самога манарха выконваў сейм Рэчы Паспалітай, які рэгулярна ў часы праўлення Уладзіслава Вазы займаўся справамі эканомій.

Сеймавых пастаноў адносна каралеўскіх эканомій у 1633–1647 гг. было некалькі: дзве – у 1633 г. і па адной – у 1635, 1638, 1641 і 1647 гг. Ужо на каранацыйным сейме ў пастанове "Аб уладаннях ЯКМ і юргельтах" шляхта забараніла аддаваць сталовыя ўладанні ў арэнду духоўным асобам і прызначаць юргельты са сталовых прыбыткаў. Таксама забаранялася прызначаць духоўных асоб адміністратарамі [9, s. 378]. На сейме 1633 г. была зацверджана асобная пастанова "Эканоміі". У ёй абвяшчалася, што каралеўскія эканоміі ні ў Польшчы, ні ў ВКЛ не будуць павялічвацца, а хто б узяў у арэнду эканомію з навадалучанымі землямі, павінен быць выкліканы ў Трыбунал. Далей канстатавалася, што эканоміі па закону нельга абцяжарваць юргельтамі, але, насуперак гэтаму, і папярэдні, і дзейсны манархі ўжо на каранацыі такія прывілеі падпісвалі. Таму патрабавалася, каб канцылярыя іх не выдавала, а тыя, хто ўжо меў прывілеі, мог карыстацца імі да канца тэрміну

дзеяння [9, s. 381]. Абодва тэксты, па сутнасці, былі спробамі паляпшэння матэрыяльнага забеспячэння манарха і падпарадкаванага яму апарату механічным шляхам, праз забарону выдаваць юргельты. Паралельна шляхта пазбавілася і ад сваіх эканамічных канкурэнтаў, г.зн. духавенства.

Наступны раз да праблемы забеспячэння манарха шляхта звярнулася на ардынарным сейме 1635 г., калі была прынята пастанова "Аб нашых сталовых уладаннях як у Кароне, так і ў ВКЛ". У ёй былі падсумаваныя ранейшыя пастановы і пацвярджалася забарона выдаваць за кошт эканомій грошы, пенсіі, юргельты, пажыццёвыя трыманні, лёгкія арэнды пад пагрозай штрафу эканому ў Кароне згодна з канстытуцыяй 1590 г., а ў ВКЛ – страты праў на трыманне згодна з працэдурай, апісанай у канстытуцыі 1607 г. На падставе канстытуцыі 1635 г. касаваліся ўсе выдадзеныя пасля каранацыйнага сейма прывілеі і лісты на юргельты і пенсіі са сталовых уладанняў, калі яны наносілі шкоду каралеўскаму скарбу. Адмяняліся ўсе выдадзеныя прывілеі на вольнасці ў эканоміях, калі яны датычыліся выплат у скарб. Канцлеру і падканцлеру забаранялася засведчваць адпаведныя прывілеі пячаткай, а падскарбію – выдаваць інтрамісію (дазвол на ўвядзенне ва ўладанне). Для лепшай рэвізіі сталовых уладанняў, дзяржаў і лясніцтваў у ВКЛ абвяшчалася рэнавацыя прывілея Жыгімонта Вазы з такой карэкціроўкай, каб дзяржавы адбіраліся не гвалтам, а праз "скарбовы працэс", альбо ўжывалася іншае пакаранне [9, s. 405].

Такім чынам, у 1635 г. сейм узмацніў ранейшыя абмежаванні і дэлегалізаваў наданні манарха ў сталовых уладаннях, але адначасова пакінуў фактычна неабмежаваныя магчымасці для захавання існага стану рэчаў праз агаворкі і права на судовую абарону ад прэтэнзій скарбу.

У 1638 г. была прынятая пастанова "Аб эканоміях", якая канстатавала, што ранейшыя заканадаўчыя нормы фактычна ігнаруюцца манархам, які працягвае раздачы за кошт эканомій. У гэтай пастанове шляхта Рэчы Паспалітай патрабавала спынення такой практыкі. Уводзіліся канкрэтныя тэрміны вяртання незаконна атрыманых уладанняў у рукі падскарбіяў. Для ВКЛ асобна агаворвалася, што адміністрацыя эканомій павінна ажыццяўляцца згодна з прывілеям Жыгімонта Вазы, які быў дэклараваны на сейме 1635 г. [9, s. 439].

Сеймавыя пастановы 1630-х гадоў канстатавалі наяўнасць сур'ёзных праблем у кіраванні эканоміямі. Становішча каралеўскіх эканомій у ВКЛ было адной з крыніц фінансавых праблем манарха і дзяржавы ў цэлым. Рэакцыяй на гэта сталі змены дзяржаўнай палітыкі ў адносінах эканомій, якія адбываліся на аснове сеймавага заканадаўства. Ужо з другой паловы 1630-х гадоў формула кантракта на арэнду каралеўскіх эканомій была дапоўнена ўстаўкай пра тое, што дамова заключаецца з улікам патрабаванняў сеймавай пастановы 1638 г. Аднак пастанова 1638 г. не ўтрымлівала дэтальных распараджэнняў адносна эканомій. Апошнія, як і староствы, павінны былі падлягаць толькі больш дэтальнаму кантролю [9, s. 439]. На практыцы рэалізацыя сеймавай пастановы азначала, што колькасць абавязкаў і патрабаванняў да арандатараў павялічвалася, а самі яны, прынамсі, дэкларатыўна сталі падлягаць большаму кантролю з боку скарбу. Змены фіксаваліся толькі пры заключэнні новых дамоваў. Так, пасля смерці брэсцкага эканома С. Паца Уладзіслаў Ваза здаў у арэнду асноўную частку гэтай эканоміі ашмянскаму падчашаму і старэйшаму афіцэру каралеўскай пешай гвардыі С. Асінскаму, а горад Ламазы і ламазскі фальварак, якія былі часткай эканоміі, былі арандаваны падскарбію земскаму М. Кішку. Абодва кантракты былі заключаны 27 лютага 1641 г. і ўтрымлівалі спасылку на сеймавую канстытуцыю, а таксама на патрабаванне "саслоўяў" перадаць эканоміі "як у найлепшыя рукі" [10, арк. 617–618].

Акрамя пошуку больш надзейных арандатараў, былі і іншыя навацыі, якія мелі рэальны эфект. Абодва згаданыя кантракты заключаліся на адзін выпрабавальны год, па выніках якога належала правесці рэвізію, а ў выпадку паспяховага выканання абавязкаў з боку арандатараў дамова магла быць працягнута яшчэ на тры гады [10, арк. 617–619]. С. Асінскі, калі зыходзіць з пазнейшай кантрактнай дакументацыі, паспяхова справіўся са сваімі абавязкамі. Доказам быў працяг арэнднай дамовы з 1645 г. на тры гады да 1648 г., у якой канстатавалася, што арандатар зрабіў усё, што мог, для росту прыбыткаў каралеўскага скарбу. Больш таго, С. Асінскі атрымаў раней вылучаныя для асобнай арэнды Ламазы. У адпаведнасці з гэтым і папярэднімі кантрактамі арэндныя выплаты належала спачатку перадаваць у скарб ВКЛ, а ўжо потым яны ішлі на выплату ўтрымання 637 каралеўскіх пешых гвардзейцаў [11, арк. 123–124адв.]. Пры ўсім жаданні мінімізаваць выдаткі дзяржава падкрэслена імкнулася захаваць пасрэдніцка-кантрольную функцыю і фармальныя адносіны ў падпарадкаваных ёй структурах.

Ніводзін кантракт канца 1630 – 1640-х гадоў не сведчыў пра жаданне ўлад праводзіць радыкальную рэформу сістэмы дзяржаўнага гаспадарання, але практыка кіравання паступова мадэрнізавалася з улікам сеймавага заканадаўства, невыкананне якога кампенсавалася паўторамі і дэталізацыяй у новых нарматыўных актах. Толькі прынятая ў 1641 г. сеймавая канстытуцыя стала даволі выразнай мяжой у адносінах дзяржавы да сталовых уладанняў [12, s. 5–6]. Гэта зафіксавана ў арэндным кантракце на Магілёўскую эканомію, падпісаным манархам 10 лютага 1643 г. У дакуменце сцвярджалася, што паводле канстытуцыі "Аб эканоміях", што была прынята на мінулым сейме з мэтай паляпшэння становішча каралеўскага скарбу, спыняліся адносіны з папярэднім адміністратарам, якім да 1642 г. заставаўся Я. Радзівіл. На гэты раз адміністрацыя эканоміі

была перададзена земскаму падскарбію М. Кішку "*на падставе сеймавай пастановы, згодна з верыфікацыяй і ардынацыяй, якую ён сам правёў*". Тэрмін адміністрацыі быў таксама абмежаваны трыма гадамі, з тым нюансам, што фактычна арэнда пачалася з дня св. Барталамея яшчэ ў 1642 г. Адметна, што ў гэтым прывілеі адсутнічала інфармацыя пра выплату М. Кішку жалавання за выкананне функцый адміністратара, што было ў яго папярэднікаў. Заўважны рост дзяржаўнага кантролю адлюстраваўся ў фіксацыі наступнага патрабавання ў адносінах да адміністратара: ён абавязваўся не толькі збіраць падаткі, але і "перад камісарамі нашымі [каралеўскімі] рабіць справаздачы" [13, арк. 411–411 адв.].

Калі справа са зменай адміністратара Магілёўскай эканоміі некалькі зацягнулася, то ў адносінах іншых эканомій ВКЛ карэкцыя ў рэчышчы выканання сеймавай пастановы 1641 г. адбылася даволі хутка. Так, ужо 22 лютага 1642 г. Уладзіслаў Ваза зацвердзіў новы кантракт паміж скарбам і А.Л. Радзівілам на арэнду Шавельскай эканоміі, але на ўмове атрымання з пэўнага часу толькі *"кожнага дзясятага гроша згодна з пажаданнем саслоўяў РП*". Арандатару нагадвалася, што ён павінен быў кіраваць і збіраць падаткі з улікам "*рэвізіі і інвентароў*", у прыватнасці, з улікам рэвізіі 1640 г., якая вызначыла памер збораў з эканоміі – 74 400 злотых. Сам А.Л. Радзівіл павінен быў атрымліваць 16 000 злотых наяўнымі грашыма за адміністрацыю плюс 4000 забіраць за ўрад маршалка ВКЛ [13, арк. 147–149].

Рашэнні сейма 1641 г. сталі каталізатарам і для змен у адносінах Кобрынскай эканоміі. Яшчэ пры жыцці Жыгімонта Вазы была прынята сеймавая пастанова "*Аб Нашых нашчадках*", на падставе якой Кобрынская і Аліцкая эканоміі прызначаліся на ўтрыманне каралевічаў Яна Казіміра і Аляксандра [9, s. 338–339].

На працягу праўлення Уладзіслава Вазы Кобрынская эканомія заставалася ў кіраванні яго брата Яна Казіміра, які пачаткова асабліва не ўмешваўся ў яе справы. Толькі сеймавыя навацыі 1641 г. сталі падставай да змен становішча ў эканоміі, адносна якой была таксама прынята асобная канстытуцыя "*Правізія яго міласці каралевіча Казіміра*" [12, s. 7]. Сведчаннем змен стала заключэнне новага арэнднага кантракта, які быў падпісаны Янам Казімірам 15 сакавіка 1642 г. і пацверджаны Уладзіславам Вазам 21 сакавіка. У арэндным кантракце ўтрымлівалася даволі нетыповая інфармацыя аб прычынах спынення адносін з папярэднім арандатарам, якім з часоў Жыгімонта Вазы з'яўляўся Я. Валовіч, генеральны жамойцкі староста. У тэксце, складзеным ад імя Яна Казіміра, сцвярджалася, што да пэўнага часу Я. Валовіч добра спраўляўся са сваімі абавязкамі, як гаспадарчымі, так і адміністрацыйнымі, пакуль не наступіла катастрафічная дэградацыя сістэмы кіравання. Наступствам нядзольнасці Я. Валовіча эфектыўна наладзіць адміністраванне сталі бясконцыя змены "*кожны раз новых*"ураднікаў у эканоміі і нарастанне незадаволенасці з боку падданых, якія скардзіліся "*амаль штодня*". Я. Валовіч сапраўды ўжо не спраўляўся са сваімі абавязкамі па прычыне саліднага ўзросту: ён ужо працяглы час толькі фармальна займаў свае пасады і дажываў свой век у Кобрыне [14, с. 413–411]. У выніку кантракт з Я. Валовічам быў скасаваны і заключана дамова з крайчым ВКЛ і адначасова Гродзенскім эканомам Г. Трызнай і яго жонкай. Паводле кантрактных умоў, Г. Трызна абавязваўся выплочваць штогод па 30 000 польскіх злотых. Ян Казімір, са свайго боку, абяцаў не пазней пачатку красавіка 1642 г. выслаць свайго слугу, які павінен быў у прысутнасці новага арандатара аб'ездзіць фальваркі з мэтай праверкі наяўнага становішча гаспадарак і здаць усё ў арэнду ў адпаведнасці з інвентаром. Спецыяльна ў дамове было нагадана, каб арандатар не дазваляў ваколічнай шляхце захопліваць землі эканоміі, а таксама не ўводзіў новыя зборы і не даводзіў гаспадарку да занядбання. Асаблівым пунктам гэтай дамовы стаў пералік абавязкаў Г. Трызны на карысць царкоўных устаноў. Каралевіч абавязаў арандатара выплочваць дзесяціну "*кобрынскім рымскім касцёлам*" у памеры 600 польскіх злотых, а таксама забяспечыць касцёлы шпітальныя ў Кобрыне і Пружанах усім належным удпаведнасці з фундушамі. Акрамя таго, 600 польскіх злотых належала аддаваць архімандрыту кобрынскага манастыра. У фінальнай частцы дамовы арандатару было нагадана, каб ён клапаціўся аб уступах у лясах, а таксама пра магчымасць здачы любых аб'ектаў эканомій ў арэнду іншым асобам [13, арк. 315–316].

Уладзіслаў Ваза даволі свабодна распараджаўся сталовымі ўладаннямі з мэтай хуткага атрымання наяўных грошай. Пра гэта сведчыць практыка здачы эканомій у 1630–1640-я гады ў арэнду-адміністрацыю ўраднікам прама не адказным за дзяржаўныя фінансы. Так было ў выпадку перадачы Магілёўскай эканоміі К. Радзівілу ў 1635 г. [15, арк. 196–197адв.], арэнды Аліцкай эканоміі ў 1635 г. – К.К. Гасеўскаму, пісару ВКЛ [15, арк. 252адв.–253] альбо арэнды Гродзенскай эканоміі ў 1643 г. – Г.М. Трызне, падчашаму ВКЛ [16, арк. 461–461адв.]. Але паступова нормай для Уладзіслава Вазы стала тэндэнцыя да рэгулярнай перадачы каралеўскіх сталовых уладанняў у адміністрацыю ці арэнду менавіта земскаму падскарбію ВКЛ. Яшчэ ў арэндным кантракце на Брэсцкую эканомію, а менавіта: горад Брэст разам з арэндай корчмаў і млыноў, з маставым і гандлёвым зборам, фальварак Рэчыца, Палескую воласць, Кіявец, Ламазы, Воін, Крывую Вярбу (Кодэнец), Мілейчыцы – перададзеную на пяць гадоў падскарбію С. Пацу ў 1634 г., было сфармулявана наступнае праграмнае абгрунтаванне неабходнасці перадачы эканоміі падскарбію: "*каб грошы да скарбу нашага хутчэй даходзілі*" [15, арк. 70адв.–72].

Рэалізацыя гэтай ідэі адбывалася павольна і дасягнула сваёй кульмінацыі пасля 1641 г. Самая багатая Магілёўская эканомія не выходзіла з рук падскарбія

ВКЛ з 1643 г. Пасля смерці М. Кішкі эканомію два гады на так званай "лічбе" трымаў Г.М. Трызна. 7 верасня 1647 г. манарх падпісаў з Г.М. Трызнам кантракт на чатыры гады на ўмове выплаты 150 000 злотых у скарб. Падскарбій атрымліваў кампенсацыю за выдаткі на судовыя працэсы па справах эканоміі, за выплаты на "*касцёлы і шпіталі*" за кошт эканоміі, а таксама за гарантыі данатарыўшам [17, арк. 1016–1016адв.].

27 чэрвеня 1646 г. падскарбій Г.М. Трызна атрымаў дазвол на пралангацыю арэнды Кобрынскай эканоміі (па загалоўку памылкова – Брэсцкай) за 30 000 злотых штогадовай выплаты ў скарб на тэрмін з 1649 па 1655 г. [17, арк. 638–638адв. ].

Гродзенская эканомія таксама апынулася пад больш дэталёвым кантролем скарбу. Уладзіслаў Ваза перадаў яе спачатку М. Кішку, пасля смерці якога кантрактныя абавязацельствы пераходзілі да яго сваякоў, а потым эканомія трапіла да тагачаснага падскарбія Г.М. Трызны. 28 лютага 1647 г. ён атрымаў эканомію ў "арэнду і адміністрацыю" на чатыры гады з выплатай штогод 40 000 злотых (з абавязкам забяспечваць выплаты па ўсіх вусных і пісьмовых распараджэннях манарха) з перспектывай атрымліваць прыбытак пасля сканчэння кантракта на ўмовах атрымання кожнага дзясятага гроша [17, арк. 794–795].

Логіка падобных рашэнняў зводзілася да канцэнтрацыі адміністрацыйнай і фіскальнай улады, але супраць гэтага працаваў суб'ектыўны фактар. Пры прызначэннях манарх арыентаваўся як на заслугі асобы, так і на памеры грашовай прапановы, якая зыходзіла ад ураднікаў, што жадалі зарабіць на эксплуатацыі дзяржаўных зямель. Але сам прынцып здачы эканомій у арэнду паволі дэфармаваўся. Замест трох гадоў, як гэта было на пачатку, тэрмін арэнды быў павялічаны да чатырох у кантрактах 1647 г. Нельга таксама не заўважыць, што праз канцэнтрацыю эканомій у руках падскарбія ўзрастала роля гэтага ўрадніка ў сістэме ўлады.

Асобным аспектам дзяржаўнай палітыкі ў адносінах эканомій было захаванне прывілеяванага становішча асобных катэгорый насельніцтва. Паўнамоцтвы эканомаў і арандатараў мелі абмежаванні ў прававых пытаннях, а насельніцтва дзяржаўных уладанняў мела магчымасць напрамую звяртацца да манарха. Асабліва гэта датычылася выпадкаў, калі правы і вольнасці былі юрыдычна афармлены. Так, маючы неабходныя дакументальныя сведчанні, шляхта вёсак Тучна і Гошчы з Брэсцкай эканоміі звярнулася ў 1645 г. да манарха з просьбай аб абароне іх праў. На падставе гэтага звароту брэсцкаму эканому С. Асінскаму, а пры яго адсутнасці ламазскаму падстаросце 2 ліпеня 1645 г. накіроўваўся з канцыляры ВКЛ "упамінальны ліст" з патрабаваннем спыніць парушэнні [17, арк. 315–315адв.]. Каб канчаткова вырашыць канфлікт, манарх у тым годзе выдаў пацвярджальны прывілей "Тучнянскай шляхце" [17, арк. 355–355адв.].

Памеры дзяржаўнай апекі маглі сягаць не толькі асобных шляхецкіх ваколіц, але і цэлых эканомій. Так, 27 сакавіка 1645 г. ад імя манарха да земскага падскарбія ВКЛ быў адасланы ліст з загадам пакінуць шляхту Магілёўскай эканоміі пры ранейшых правах. Прычынай такога рашэння былі заслугі шляхты перад Рэччу Паспалітай пад час апошняй вайны. Уладзіслаў Ваза распарадзіўся не накладаць на шляхту "*ўсялякіх цяжараў меншых, якія належала выплачваць магілёўскім валашчанам*", а ў якасці падзякі вызваліў шляхту, якая трымала землі на ўмовах чыншавых выплат, ад пастойнай павіннасці, гайдучызны, заезднай павіннасці і інш. [17, арк. 155адв.–156]. З гэтага дакумента вынікае выснова адносна эканамічнай і сацыяльнай палітыкі дзяржавы, для якой прынцыпова важнымі былі не толькі грашовыя паступленні ў скарб, а і наяўнасць лаяльнай праслойкі насельніцтва, якой была мясцовая шляхта.

Сведчаннем узмацнення дзяржаўнага кантролю за становішчам эканоміі была сеймавая пастанова 1647 г. Яна мела назву "Аб рэвізіях" і фармальна адносілася да ўсіх дзяржаўных уладанняў. З пастановы вынікала, што да ўлад дайшлі скаргі на дзяржаўцаў, якія ажыццяўлялі рэвізіі дзеля перагляду меж. Пастанова ўдакладняла, што, згодна са старадаўнімі правамі, дзяржаўныя і шляхецкія землі размяжоўваюцца не рэвізорамі, а толькі спецыяльна высланымі камісарамі [12, s. 63]. Такім чынам, мэтай дадзенага закона было пацвярджэнне дзейснай практыкі, пры гэтым сейм замацаваў прыярытэт пры вырашэнні памежных спрэчак за калегіяльнымі органамі, а не за часовымі трымальнікамі дзяржаўных уладанняў.

**Заключэнне.** Рост колькасці сеймавых пастаноў адносна каралеўскіх эканомій у першыя гады праўлення Уладзіслава Вазы сведчыў пра неабходнасць змены палітыкі ў адносінах дзяржаўных уладанняў. У 1638–1641 гг. былі юрыдычна афармлены і пачалі рэалізоўвацца на практыцы змены ў парадку кіравання каралеўскімі эканоміямі з мэтай павелічэння іх прыбытковасці. Гэтыя змены былі выкліканы як цяжкім фінансавым становішчам скарбу, так і нежаданнем шляхты несці звышвыдаткі на ўтрыманне манарха. Змены прадугледжвалі абмежаванне тэрмінаў дзеяння кантрактаў, выбар больш адказных арандатараў. Прыклад Кобрынскай эканоміі сведчыць, што на пачатку праўлення Уладзіслава Вазы адзінай палітыкі ў адносінах дзяржаўных уладанняў (эканомій) не было, а неадпаведнае адміністраванне магло быць разбуральным для эканомій. Рэальныя змены палітыкі кіравання наступілі толькі з пачатку 1640-х гадоў і мелі відавочна станоўчую дынаміку, паколькі дазволілі ўніфікаваць арэндную практыку, перадаць большую і найбольш прыбытковую частку эканомій пад кантроль міністра фінансаў – земскага падскарбія ВКЛ. Аднак для ажыццяўлення сеймавых пастаноў у адносінах эканомій ВКЛ існавала аб'ектыўная перашкода – сацыяльная палітыка дзяржавы, якая абапіралася на арыстакратыю, служыла шляхце, але не магла ігнараваць інтарэсы насельніцтва эканомій.

## Літаратура


1. Kościałkowski, S. Ze studjów nad dziejami ekonomji królewskich na Litwie / S. Kościałkowski // Rocznik Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie. – 1911–1914. – Wilno: Druk Józefa Zawadzkiego w Wilnie, 1914. – T. V. – S. 86–168.
2. Kościałkowski, S. Antoni Tyzenhauz poskarbi nadworny litewski / S. Kościałkowski. – T. I. – Londyn: Wydawnictwo Społeczności Akademickiej Uniwesytetu Stefana Batorego, 1970. – 686 s.
3. Кітурка, І.Ф. Дзяржаўныя ўладанні на землях Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.: палітыка дзяржаўнага аднаўлення і развіцця / І.Ф. Кітурка; пад рэд. В.Ф. Голубева. – Гродна: ГрДУ, 2003. – 173 с.
4. Filipczak-Kocur, A. Skarbowość Rzeczypospolitej 1587–1648: projekty, ustawy, realizacja / A. Filipczak-Kocur. – Warszawa: Wydawnictwo Sejmowe, 2006. – 438 s.
5. Мелешко, В.И. О феодальной ренте и развитии товарно-денежных отношений в королевских экономиях Восточной Белоруссии в конце XVI–XVIII вв. / В.И. Мелешко // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1962. – Минск: Изд-во «Наука и техника», 1964. – С. 221–230.
6. Галубовіч, В. Прапановы па павелічэнні прыбытковасці Магілёўскай эканоміі ў другой палове 1630-х гадоў у інструкцыі соймавым агентам віленскага ваяводы і вялікага гетмана ВКЛ Крыштапа Радзівіла / В.У. Галубовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2021. – № 5. – С. 10–18.
7. Volumina legum. Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego: w 2 t. – Petersburg: Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki; 1859. – T. II. – 482 + XIII s.
8. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów. – Dz. II. – Sygn. 1211.
9. Volumina legum. Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego: w 10 t. – Petersburg: Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki. –1859. – T. III. – 472 + XV s.
10. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 113. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. – 1637–1641. – 683 с.
11. НГАБ. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 119. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. – 1645–1647. – 1004 с.
12. Volumina legum. Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarów w Warszawie, od roku 1732 do roku 1782, wydanego: w 10 t. – Petersburg: Nakladem i drukiem Jozafata Ohryzki; 1859. – T. IV. – 501 + XVII s.
13. НГАБ. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 118. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. – 1638–1643. – 528 с.
14. Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV–XVIII стст. / склад. А.Я. Янушкевіч; навук. рэд. А.І. Шаланда. – Мінск: Медысонт, 2014. – 508 с.
15. НГАБ. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 111. – Кніга засведчаных спраў у вялікай канцылярыі. – 1634–1636. – 737 с.
16. НГАБ. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 118. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. – 1638–1643. – 528 с.
17. НГАБ. – Ф. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 119. – Кніга засведчаных спраў у меншай канцылярыі. – 1645–1647. – 1004 с.


*Паступіў у рэдакцыю 18.03.2025*